НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

# Палажэнне
# аб літаратурным конкурсе “Беларускі салавей”, прысвечаным 135-годдзю з дня нараджэння Змітрака Бядулі, у рамках праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця”

Мэта літаратурнага конкурсу “Беларускі салавей”, прысвечанага 135-годдзю з дня нараджэння Змітрака Бядулі (далей – Конкурс), – адзначыць шырокай аўдыторыяй юбілейную дату і прыцягнуць увагу да прысвечанага Змітраку Бядулю раздзела ў рамках віртуальнага праекта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі “На хвалі часу, у плыні жыцця”.

**Задачы:**

- прыцягнуць увагу шырокай аўдыторыі да вывучэння беларускай літаратуры і прывабіць да пазнання нацыянальных культурных каштоўнасцей;
- павысіць чытацкую цікавасць да фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якія даступны анлайн;
- стымуляваць творчую актыўнасць вучняў школьных і пазашкольных устаноў, моладзі і творча актыўных слаёў насельніцтва.

**Арганізатар Конкурсу:** Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

**Партнёры Конкурсу:** Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, Вялікі тэатр Беларусі, РВУ “Выдавецкі дом «Звязда»”, часопіс “Бярозка”, газеты “Літаратура і мастацтва”, “Настаўніцкая газета”.

**Конкурсная работа:** эсэ з сюжэтнай лініяй (prequel, sequel або spin-off) па творы Змітрака Бядулі. Сюжэт эсэ можа адлюстроўваць жыццё галоўных і другарадных герояў, што па ўнутранай храналогіі папярэднічала б падзеям твора (prequel) ці стала б яго працягам (sequel). У эсэ можа быць прадстаўлена і паралельнае арыгінальнаму сюжэту развіццё падзей, дзе сустракаюцца ўжо знаёмыя нам персанажы ці эпізоды, якія адбываліся на другім плане (spin off).

На выбар прапануюцца чатыры творы Змітрака Бядулі: **“Салавей”, “Сярэбраная табакерка”, “Бондар”, “На Каляды к сыну”.** Эсэ павінна мець назву, быць упершыню прадстаўлена для публікацыі і адпавядаць патрабаванням Конкурсу. Дасланыя на Конкурс работы не рэцэнзуюцца. Мова эсэ – **беларуская**.

**Удзельнік Конкурсу мае права прадставіць некалькі работ пры ўмове выкарыстання сюжэтных ліній з розных вышэйназваных твораў Змітрака Бядулі.**

**Удзельнікі Конкурсу:** усе жадаючыя незалежна ад узросту.

**Форма правядзення:** усе работы прымаюцца толькі анлайн, удзел у Конкурсе БЯСПЛАТНЫ.

**Тэрмін прыёму работ:** з 1 па 31 кастрычніка 2021 года ўключна.

**Падвядзенне вынікаў Конкурсу:** пераможцы Конкурсу і дата цырымоніі ўзнагароджання будуць аб’яўлены на партале www.nlb.by і ў

сацыяльных сетках Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама на сайтах і ў сацыяльных сетках інфармацыйных партнёраў.

**Патрабаванні да афармлення:**

Эсэ афармляецца ў фармаце **MS Word** (DOC, DOCX, RTF), памер не перавышае 3 старонкі фармату А4 (не больш за 7 000 друкаваных знакаў з прабеламі), шрыфт Times New Roman, памер 14.

Для ўдзелу ў Конкурсе ўдзельнік павінен даслаць запоўненую **анкету** (MS Word) і **конкурсную работу** (эсэ) на электронную пошту konkurs.nlb@gmail.com з назвай файла "Прозвішча_Назва літаратурнага твора".

| Анкета ўдзельніка | |
|---|---|
| 1. Фотаздымак удзельніка | |
| 2. Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| 3. Узрост удзельніка, клас | |
| 4. Адукацыйная ўстанова | |
| 5. Паштовы адрас установы | |
| 6. Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога | |
| 7. Назва выбранага твора Змітрака Бядулі | |
| 8. Назва эсэ (конкурснай работы) | |
| 9. Сюжэтная лінія эсэ (prequel, sequel, spin-off) | |
| 10. Тэлефон, e-mail | |
| 11. Ці ўдзельнічалі вы ў Рэспубліканскім анлайн-конкурсе чытальнікаў "О, Беларусь, мая шыпшына" да 120-годдзя У. Дубоўкі (так / не) | |

***Арганізатары Конкурсу маюць права не прыняць работу пры незапаўненні палёў анкеты.***

Удзельнік, які падаў заяўку, дае згоду на апрацоўку персанальных даных, размяшчэнне конкурснай работы на партале і ў сацыяльных сетках Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з указаннем аўтара работы і яго фотаздымкам.

**Падвядзенне вынікаў Конкурсу і ўзнагароджанне:**

Работы ацэньвае экспертнае журы ў складзе:

**Яна Будовіч** – гісторык, журналіст, рэдактар газеты "Літаратура і мастацтва", аўтар артыкулаў на літаратуразнаўчыя тэмы ў перыядычным друку,

**Аксана Данільчык** – беларуская паэтка, перакладчыца, кандыдат філалагічных навук,

**Віктар Жыбуль –** літаратуразнавец, паэт, вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, кандыдат філалагічных навук,

**Зоя Мельнікава** – выкладчык Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, доктар філалагічных навук, прафесар,

**Ігар Шаладонаў** – старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат філалагічных навук.

**Крытэрыі ацэнкі:** конкурсная работа павінна быць напісана на літаратурнай мове, улічваць зыходны літаратурны матэрыял, несці арыгінальную аўтарскую ідэю, адзначацца стылістычнай выбудаванасцю і логікай выкладу, раскрываць праблему і яркасць сюжэту.

**Пераможцы Конкурсу будуць узнагароджаны:**

- памятнымі дыпломамі і падарункамі ад нашых партнёраў;
- запрашэннем на выніковае мерапрыемства Конкурсу, якое адбудзецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі;
- экскурсіяй па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (з наведваннем музея кнігі і пад'ёмам на аглядную пляцоўку).

Таксама будуць выбраны **прызёры ў дадатковых намінацыях**, якія будуць узнагароджаны:

- памятнымі дыпломамі і падарункамі ад партнёраў;
- экскурсіяй па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (з наведваннем музея кнігі і пад'ёмам на аглядную пляцоўку).

Лепшыя творы ўдзельнікаў Конкурсу будуць надрукаваны ў газеце "Літаратура і мастацтва", часопісе "Бярозка" і апублікаваны на партале www.nlb.by, у сацыяльных сетках Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, суполцы Фэйсбуку "Маладняк – першае літаратурнае аб'яднанне Беларусі", а таксама на сайтах і ў сацыяльных сетках інфармацыйных партнёраў Конкурсу.

**Кантактная інфармацыя:**

Тэлефоны для даведак: (8 017) 293 27 19, 293 29 69, 293 27 43.